**УДК 94(476) “17/20”**

# ЯЎРЭЙСКАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў АГРАРНАЙ ПАЛІТЫЦЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТ.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І СУЧАСНЫ СТАН ДАСЛЕДАВАННЯЎ

***К.А. ТАЛЯРОНАК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуецца гістарыяграфія і сучасны стан даследаванняў гісторыі яўрэйскага насельніцтва Беларусі, якое ажыццяўляла сельскагаспадарчую дзейнасць на беларускіх землях на працягу XIX стагоддзя. Робіцца выснова, што гісторыя вывучэння дадзенага пытання пачынацца з другой паловы XIX стагоддзя. Першыя працы, якія закранаюць праблему аграрнай палітыкі ў адносінах да яўрэйства, часта насілі публіцыстычны характар з выразнай суб'ектыўнай пазіцыяй аўтара. Аднак ужо з апошняй трэці XIX стагоддзя закладваецца навуковая традыцыя ў вывучэнні яўрэйскай гісторыі. За перыяд XIX – пачатак XXI стагоддзя па гэтай тэме быў назапашаны некаторы фактычны матэрыял. На яго аснове з'явіўся шэраг даследаванняў, якія закранаюць гісторыю яўрэйскай сельскай гаспадаркі на тэрыторыі беларускіх і ўкраінскіх земляў у кантэксце агульнай гісторыі расійскага яўрэйства. Аднак на сёняшні дзень комплекснага і сістэмнага даследавання, прысвечанага гісторыі яўрэяў-земляробаў на Беларусі ў кантэксце беларускай гісторыі няма, што абумоўлівае яе грунтоўны аналіз і падрабязнае асвятленне.*

***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія, яўрэйскае насельніцтва, яўрэйская сельская гаспадарка.*

**Уводзіны.** У межах вызначанага даследавання ажыццяўляецца спроба раскрыць гісторыю аграрнай палітыкі Расійскай імперыі ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва Беларусі праз аналіз удзелу яўрэяў у сельскай гаспадарцы Беларусі на працягу XIX стагоддзя. Вызначэнне ролі яўрэяў-земляробаў у сацыяльна-эканамічным жыцці беларускай вёскі з'яўляецца значным гістарычным аспектам як для гісторыі асобных населеных пунктаў, так і сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі ў цэлым. Даследчыкі яўрэйскай гісторыі неаднаразова звярталі ўвагу на выключную ролю яўрэйскага этнасу ў жыцці беларускіх гарадоў мяжы аселасці, што, відавочна, было абумоўлена колькасным фактарам. Пачынаючы з канца XVIII і да пачатку XX стагоддзя ў некаторых беларускіх гарадах колькасць яўрэяў складала каля 70% ад агульнай колькасці гарадскіх жыхароў. Яўрэйская вясковая гісторыя радзей прыцягвала ўвагу гісторыкаў, так як колькасць вясковага яўрэйскага насельніцтва ў параўнанні з гарадскім была зачна меншай. Гэтаму садзейнічала супярэчлівая міграцыйная палітыка расійскага ўрада, па выніках якой яўрэйскаму насельніцтву было забаронена сяліцца ў вёсцы за выключэннем яўрэяў-земляробаў.

Аналіз гістарычных даследаванняў па вызначанай тэме прывёў да высноў, што для максімальна поўнага асвятлэння аграрнай гісторыі яўрэяў на беларускіх землях неабходна ўлічваць тры грунтоўныя групы прац: даследаванні па гісторыі расійскага заканадаўства адносна яўрэйскага пытання, працы па гісторыі расійскага яўрэйства і гістарычныя даследаванні, прысвечаныя яўрэям-земляробам.

**Асноўная частка.** Трэба адзначыць, што гістарыяграфія даследавання яўрэйскай сельскагаспадарчай дзейнасці на Беларусі прадстаўлена адносна невялікім колам навуковых манаграфій і артыкулаў. Пытанні гісторыі беларускіх яўрэяў доўгі час не падымаліся ў навуковай літаратуры як айчыннай, так і замежнай. Гэта звязана з тым, што традыцыйна ў гістарыяграфіі яўрэйская гісторыя Беларусі не вылучалася з агульнай гісторыі яўрэйства Расіі, так як асноўная колькасць яўрэяў Расійскай імперыі пражывала ў межах яўрэйскай аселасці, якая праходзіла па тэрыторыі Беларусі, Літвы і Украіны. Падцверджаннем такой пазіцыі ў руска-яўрэйскай гістарыяграфіі могуць служыць словы гісторыка, пачынальніка руска-яўрэйскай гістарычнай навукі С. Дубнова: “Отделить историю евреев в России от истории их в Польше и Литве невозможно, потому что евреи всех этих стран составляют при всем различии местных оттенков, одну культурно-бытовую единицу, имеют одно общее прошлое, испытали и ныне испытывают одни и те же судьбы, жили и живут под одинаковым режимом, наконец, потому что предки всех нынешних «русских» евреев были польскими евреями…” [1, с. 7]. Трэба адзначыць, што паняцце “рускае” або “расійскае яўрэйства” адносіцца не толькі да яўрэйскага насельніцтва цэнтральнай Расіі. “Рускае яўрэйства” – гэта жыхары беларускіх, украінскіх і літоўскіх земляў [2, с. 26]. У працах дарэвалюцыйных гісторыкаў беларускіх яўрэяў, у залежнасці ад гістарычнага перыяду, да падзелаў Рэчы Паспалітай называлі “яўрэі Польшчы”, з моманту ўваходжання беларускіх земляў у склад Расійскай Імперыі – “яўрэі Паўночна-Заходняга краю”, “беларускія яўрэі”, “літвакі”. Сёння некаторыя навукоўцы Захаду, якія займаюцца вывучэннем гісторыі беларускіх яўрэяў, у сваіх працах працягваюць выкарыстоўваць гэтыя тэрміны [1, с. 7].

Пры даследаванні аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў адносінах да беларускага яўрэйства мэтазгодным будзе ў першую чаргу правесці агляд прац па гісторыі заканадаўства Расійскай імперыі ў сферы стварэння самастойнай сацыяльнай групы яўрэяў-земляробаў.

Першымі, хто звярнуўся да даследаванняў заканадаўства па яўрэйскім пытанні, былі расійскія і яўрэйскія гісторыкі, юрысты, публіцысты, чыноўнікі. Вывучэннем прававога становішча яўрэяў на працягу XIX стагоддзя займаліся Ф.І. Леантовіч, В.О. Леванда, І.Г. Аршанскі і шэраг іншых даследчыкаў. Значную каштоўнасць для арыентацыі ў заканадаўчых актах аб яўрэях-земляробах набыла праца юрыста В.О. Леванды, які склаў "Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев, от уложения царя Алексея Михайловича до настоящего времени, 1649–1873. Извлечение из Полных собраний законов Росс. Империи" [3], выдадзены ў Санкт-Пецярбургу у 1874 годзе. Нягледзячы на некаторыя пропускі заканадаўчых актаў, дапушчаныя аўтарам, зборнік з'яўляецца вельмі каштоўным дапаможнікам пры даследаванні расійскага заканадаўства аб яўрэях. У дачыненні да аграрнай гісторыі яўрэяў у працы вылучаны асобныя раздзелы, якія даюць пералік заканадаўчых дакументаў аб яўрэях-земляробах, яўрэйскім землеўладанні і інш.

Трэба адзначыць, што выданню збора законаў папярэднічаў артыкул, прысвечаны тэме яўрэйскага земляробства на тэрыторыях Расійскай імперыі. У 1872 годзе В.О. Леванда надрукаваў грунтоўны артыкул "К вопросу о земледелии у евреев в России" [4]. Пасля юрыст працягнуў працу над гэтай тэмай у часопісе-штотыднёвіке "Русский еврей", дзе выйшлі ў свет некалькі артыкулаў пад агульнай назвай "К вопросу о земледелии у евреев в России" [5, 6]. Аўтар ажыццявіў спробу зрабіць дэтальны аналіз прычын цяжкага становішча яўрэяў-земляробаў на беларускіх і ўкраінскіх землях і выявіць прыроду адмоўнага стаўлення грамадства да новай сацыяльнай групы яўрэйскіх гаспадароў.

Выпускнік Наварасійскага (Адэсскага) універсітэта, вядомы юрыст, публіцыст і грамадскі дзеяч другой паловы XIX стагоддзя І.Г. Аршанскі быў адным з першых, хто звярнуўся да вывучэння эканамічнага становішча яўрэйскага насельніцтва праз аналіз заканадаўчых актаў расійскага ўрада. У сваёй працы "Русское законодательство о евреях" (1877) [7] ён выказваўся за наданне яўрэям роўных з астатнім насельніцтвам правоў. Каштоўнасць працы І.Г. Аршанскага "Русское законодательство о евреях" заключаецца ў тым, што ён не толькі даў каментарыі да заканадаўчых актаў аб яўрэях, але і зрабіў спробу даследаваць гістарычнае развіццё матываў стварэння гэтых законаў у сувязі з агульным ходам юрыдычнага жыцця ў Расійскай імперыі. Нягледзячы на публіцыстычны характар працы, аўтар на навуковым узроўні даказаў, што прававое становішча яўрэяў – гэта вельмі важны фактар у агульным строі іх жыцця. Такія высновы прывялі да асазнання неабходнасці напісання асобнага раздзелу дысертацыі, прысвечанай аналізу заканадаўчых актаў Расійскай імперыі, якія рэгулявалі працэс стварэння і станаўлення яўрэйскіх земляробчых калоній і пасяленняў у беларускіх губернях.

Аўтарству І.Г. Аршанскага належыць таксама нарыс аб юрыдычным статусе яўрэйскіх каланістаў Расійскай імперыі [8]. Ён засяродзіў сваю ўвагу на тоеснасці і прычынах размежвання паняццяў "яўрэй-каланіст" і "яўрэй-земляроб" у імперскім заканадаўстве і ў судовай практыцы. У сваёй працы ён прыходзіць да высновы і ўпэўнена даказвае, што згодна заканадаўчым актам гэтыя два паняцці сінанімічныя і рашэнні судовых спраў з удзелам яўрэйскага насельніцтва павінны вырашацца ў адпаведнасці з існуючым заканадаўствам.

Самымі знакавымі і фундаментальнымі даследаваннямі XIX стагоддзя па гісторыі яўрэйскага земляробства на Беларусі і ўвогуле на тэрыторыі Расійскай імперыі з'яўляюцца кнігі Віктара Нікітавіча Нікіціна. Яшчэ хлопчыкам ён быў узяты ў кантаністы, пасля шмат год вывучаў архівы афіцыйнай перапіскі Пецярбурга і Наваросіі. Праца з архівамі абумовіла насычанасць яго даследаванняў шырокім колам розных дакументаў і статыстычных матэрыялаў. У 1887 годзе першай выйшла ў свет яго праца "Евреи земледельцы: историческое, законодательное, административное и бытовое положение колоний со времени их возникновения до наших дней. 1807–1887" [9], якая ўсебакова апісвае становішча яўрэйскіх земляробчых калоній Херсонскай і Кацярынаслаўскай губерній. Аднак для яўрэйскай аграрнай гісторыі Беларусі найбольшую каштоўнасць набыла яго другая праца "Еврейские поселения Северо и Юго-Западных губерний (1835–1890 гг.)" [10]. На сёняшні дзень гэта праца – адзіная манаграфія па вызначанай тэме.

Манаграфія В.Н. Нікіціна «Еврейские поселения Северо и Юго-Западных губерний (1835–1890)», якая, яшчэ раз падкрэслім, з'яўляецца адзінай манаграфіяй па гісторыі яўрэйская сельскай гаспадаркі на Беларусі, заслугоўвае падрабязнага разгледжання і аналізу. Праца выйшла ў свет у 1894 годзе. Тэкст амаль цалкам пабудаваны на архіўных справах, да якіх аўтар меў прамы доступ. Аўтарам працы адзначана, што архіўных спраў аб яўрэйскіх пасяленцах у беларускіх губернях нашмат менш, чым спраў аб яўрэйскіх калоніях у Паўднёвых губерніях (Кацярынаслаўскай і Херсонскай). Даследчык падкрэслівае, што мэтай працы з'яўляецца "безпристрастно осветить колонизационный предмет, по которому до появления нашей книги "Евреи-земледельцы" в русской литературе не имелось никаких, из официальных источников, обстоятельных данных…" [10, с. 11]. У асобных 34 разделах грунтоўна

апісваецца працэс стварэння земляробчых калоній на беларускіх тэрыторыях, матэрыяльныя выдаткі, спосабы кіравання калоніямі, умовы жыцця і іншыя аспекты гісторыі яўрэяў-земляробаў на Беларусі. У аснову працы пакладзены прынцып аб’ектыўнасці. Аўтар гэта неаднаразова падкрэслівае. Тым не менш шэраг тагачасных даследчыкаў такіх, як эканаміст Багушэвіч Ю.М., абвінавачвалі Нікіціна ў суб’ектыўнасці падыходу да пытання і імкненні абараніць яўрэяў у вачах імперскага грамадства. Праца В.Н. Нікіціна выклікала значны інтарэс з боку не толькі айчынных крытыкаў і аўтараў, але і атрымала хуткія станоўчыя водгукі ў польскай, нямецкай і французскай публіцыстыцы. Кніга “Еврейские поселения Северо и Южно-Западный губерний (1835–1890)” зацікавіла таксама тагачасных аўтарытэтных эканамістаў А.М. Ягунава, А.П. Субоціна, М.П. Заламанава.

Аднак нягледзячы на буйное кола выкарыстаных крыніц, працы В.Н. Нікіціна маюць шэраг недахопаў. У даследаваннях напластавана шмат архіўных дакументаў, якія часта падаюцца без аналізу і са шматразовай паўтаральнасцю, дэталёвыя на першы погляд табліцы не заўсёды поўныя (не ўзгадваюцца некаторыя беларускія губерні). Статыстычны матэрыял, прыведзены ў даследаванні Нікіціна, не быў цалкам сістэматызаваны. Аднак дадзеныя па некаторым беларускім губерням (Магілёўская і Мінская) з’яўляюцца адзінай крыніцай па гісторыі земляробчых пасяленняў на Беларусі з-за адсутнасці ці дрэннай захаванасці дакументаў у архівах Беларусі і Расіі. Гэты факт дазваляе аднесці манаграфію “Еврейские поселения Северо и Южно-Западный губерний (1835–1890)” да разраду крыніц пры даследаванні гісторыі яўрэйскай сельскагаспадарчай дзейнасці на Беларусі.

Актуальнасць праблемы палітычна-прававога статусу яўрэяў, з’яўленне даследаванняў і публікацый заканадаўчых актаў сведчыла аб росце цікаўнасці ў тагачасным грамадстве да яўрэйскага пытання.

Аднак да пачатку 80-х гадоў XIX стагоддзя працы па гісторыі яўрэяў Расійскай імперыі насілі хутчэй публіцыстычны характар, чым навуковы. Да разраду такіх даследаванняў можна аднесці кнігі і артыкулы М.М. Галіцына, М.Д. Градоўскага і інш. М.М. Галіцын лічыў яўрэйскую палітыку царскай адміністрацыі на новадалучаных пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай землях неарганічнай, аднак падкрэсліваў перыядычнасць станоўчых памкненняў у вырашэнні яўрэйскага пытання. М.Д. Градоўскі, напрыклад, разглядаючы правы яўрэяў у Расіі, выказваў меркаванне, што захаванне мяжы аселасці наносіць страты эканамічнаму развіццю імперыі. Ён быў прыхільнікам ураўнавання правоў яўрэяў з астатнімі жыхарамі Расіі, падкрэсліваў неабходнасць спрашчэння заканадаўства [2, с. 8].

Менавіта з канца XIX – пачатку XX стагоддзя са з’яўленнем яўрэйскай навукова гістарычнай школы ў Пецярбурзе, заснавальнікам якой быў С.А. Бяршадскі, а пераемнікам С.М. Дубнаў, пачалася мэтанакіраваная праца па вывучэнню гісторыі расійскага, а значыць і беларускага яўрэйства. С.М. Дубнаў стаў цэнтральнай фігурай ў гістарыяграфіі яўрэйскай гісторыі канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Яго аўтарству належаць такія важкія працы па яўрэйскай праблематыцы як “Новейшая история еврейского народа. (1789–1881)” [11], “Евреи в России и Западной Европе в эпоху антисемитской реакции. (1894–1914)” [12] і інш [13, 14].

Галоўным чынам палітычна-прававым аспектам яўрэйскай гісторыі былі прысвечаны працы маладога гісторыка Ю.І. Гесэна. Ён змог увесці ў навуковы зварот сотні архіўных дакументаў. А адно з яго асноўных даследаванняў па гісторыі яўрэяў “История еврейского народа в России” [15] цалкам заснавана на дакументах, звязаных з беларускім яўрэйствам. Шырокае кола тэматычных сюжэтаў гэтай працы закранае гісторыю царскага заканадаўства аб яўрэях. Аднак прысутнічаюць і вынікі даследаванняў унутранага жыцця яўрэйскага насельніцтва. Пэўную важнасць для даследавання аграрнай палітыкі Расійскага ўрада ў адносінах да яўрэяў прадстаўляе яго наступная праца “О жизни Евреев в России. Записка в Государственную Думу” [16]. У асобным падраздзеле кнігі аўтар дае пералік і кароткі аналіз абмежаванняў да яўрэяў вёсак і сёлаў.

Трэба адзначыць, што Ю.І. Гесэн быў першым гісторыкам, які атрымаў доступ у дзяржаўныя архівы. На думку даследчыка, стваральнікамі рускага заканадаўства часоў імперыі рухала памылковая думка аб тым, што яўрэі сваёй эканамічнай дзейнасцю стваралі сур’ёзную пагрозу гаспадарчай дзейнасці насельніцтва імперыі, галоўным чынам сялянству. Гэту навуковую праблему закранаў у сваіх працах і Н.Н. Галіцын. Адрозненне паміж дзвюма даследчыцкімі інтэрпрытацыямі заключалася ў тым, што Галіцын сапраўды лічыў яўрэяў вінаватымі ў беднасці сялянства. Гесэн, наадварот, сцвярджаў, што расійскі ўрад рабіў з яўрэяў адзіных вінаватых у надзвычай неспрыяльным становішчы сялянства, пакідаючы без увагі самавольства памешчыкаў-землеўласнікаў. Такія палажэнні замацоўваліся ў заканадаўстве, у выніку чаго ў Расіі неаднаразова прымаліся непадрыхтаваныя і таму часта правальныя спробы змяніць характар жыцця яўрэяў [17, с. 21].

Прававыя аспекты земляробчага пытання ў адносінах да яўрэйскіх землеўласнікаў даследаваў Б.Г. Альшамоўскі. Яго гістарычна-юрыдычная праца дазваляе прааналізаваць погляд расійскіх улад на яўрэйскае землеўладанне ў XIX стагоддзі [18].

Канец XIX – пачатак XX стагоддзя азнамянаваны з'яўленнем шэрагу калектыўных абагульняючых прац. Значнай падзеяй павінен быў стаць выхад пятнадцацітомнай "Истории еврейского народа" [17, с. 22]. Другім выданнем, якое стала своеасаблівым вынікам дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі, была Яўрэйская энцыклапедыя. Рэдакцыя ўключыла ў яе даволі арыгінальныя артыкулы па гісторыі ўсходнееўрапейскага яўрэйства. Яўрэйскаму землеўладанню і земляробству, у тым ліку і на беларускіх тэрыторыях Расійскай імперыі, прысвечаны артыкулы "Земледелие среди евреев в России" [19], "Землевладение по русскому законодательству" [20].

Пры даследаванні яўрэйскага земляробчага вопыту важна звярнуць увагу на працы па гісторыі яўрэйскіх земляробчых пасяленняў у XIX стагоддзі на тэрыторыі ўкраінскіх губерняў. У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі можна адзначыць працу Б.Б. Бруцкуса "Еврейские земледельческие поселения Екатеринославской губернии (статистико-экономические очерки и исследования) (1910) [21]. Праца з тэксам даследавання дазваляе стварыць сацыяльна-эканамічны партрэт яўрэйскага земляроба XIX стагоддзя і правесці параўнальную характарыстыку гістроыі станаўлення і развіцця аграрнага эксперыменту з яўрэйскім насельніцтвам на Беларусі і Украіне.

Трэба адзначыць, што з пачаткам Першай сусветнай вайны праца над некаторымі даследаваннямі была спынена. Сярод іх даследаванні І. Чэрыковера, І. Цынберга, П. Марэка, шматтомная "История еврейского народа" [17, с. 25]. Тым не менш, дзякуючы працы некалькіх пакаленняў гісторыкаў Расійская імперыя стала адным з буйнейшых цэнтраў яўрэйскіх гістарычных даследаванняў у тагачасным свеце. Былі пастаўлены важныя гістарыяграфічныя праблемы, створана шырокая крыніцазнаўчая база, закладзена навуковая традыцыя.

Накіраванасць і рэзультатыўнасць працы савецкіх гісторыкаў вельмі добра адлюстраваны ў працы Н.І. Рутберга, які сумесна з калегамі стварыў храналагічна-тэматычны паказальнік літаратуры аб яўрэях [22], выдадзенай за 1917–1991 гады на рускай мове. Аўтарамі ставілася задача не толькі паказаць, што публікавалася аб яўрэях і па яўрэйскаму пытанню, але і прадэманстраваць дынаміку гэтых выданняў па гадам ад падзення імператарскай Расіі да распаду савецкага рэжыму. Храналагічны прынцып размеркавання матэрыялу дае выразнае прадстаўленне аб палітыцы савецкіх уладаў у адносінах да яўрэйскага насельніцтва. Калі ў 1917–1919 гадах публікацыі розных яўрэйскіх арганізацый даволі шматлікія, то ў 20-я і пачатку 30-х гадоў іх у значнай ступені змяняюць выданні ОЗЕТа і КОМЗЕТа.

Падцверджаннем высноў Н.І. Рутберга стаў яшчэ той факт, што ўзнікшыя ў сярэдзіне 20-х гадоў XX стагоддзя даследчыцкія цэнтры па вывучэнню яўрэйскай гісторыі, асноўныя з якіх былі ў Мінску і Кіеве, толькі на працягу першых некалькі год сваёй дзейнасці змаглі прадоўжыць папярэдні накірунак руска-яўрэйскай гістарычнай навукі. Так, заснаваны ў 1924 годзе ў Мінску ў Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульт) яўрэйскі аддзел інтэўсіўна займаўся гістарычнымі даследаваннямі. У гэты перыяд у рэспубліцы праводзілася палітыка беларусізацыі, якая выступала за развіццё нацыянальных культур як беларускай, так і іншых народаў, пражываючых на тэрыторыі БССР. Гэта стымулявала развіццё гістарычнай навукі. У друкаваным органе яўрэйскага аддзела Інбелкульта – часопісе "Цайтшрыфт" ("Временник") друкаваліся працы гістарычнай, сацыялагічнай і краязнаўчай секцый аддзела. Але ў пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя сітуацыя ў рэспубліцы мяняецца. Яўрэйскіх гісторыкаў пачынаюць абвінавачваць у нацыяналізме, шавінізме і сіянізме. Шмат даследчыкаў было рэпрэсіравана. Дзейнасць гістарычнай секцыі звярнулася да вывучэння ўдзела яўрэйскіх працоўных у рэвалюцыйным руху. [2, с. 9–10]. Наступныя падзеі палітычнага і сацыяльна-грамадскага характару садзейнічалі зачыненню аддзела ў пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя. Пачынаючы з гэтага моманту і да 90-х гадоў не з'явілася ніводнай навуковай працы па гісторыі яўрэяў. Адносна яўрэйскага земляробства на Беларусі і ў цэлым у Расійскай імперыі ў навуковай літаратуры распаўсюджвалася думка аб тым, што імперскі ўрад вельмі адмоўна ставіўся да ідэй аб далучэнні яўрэйскага насельніцтва да сельскагаспадарчай дзейнасці. У савецкага аўтара 20-х гадоў Ю. Ларына "Евреи и антисемитизм в СССР" катэгарычным тонам сцвярджаецца аб тым, што царскі ўрад забараняў яўрэйскаму насельніцтву займацца земляробствам [23, с.36].

З пачаткам 90-х гадоў XX стагоддзя на Беларусі, як і ў іншых рэспубліках былога СССР, пачынаецца якасна новы этап у гістарычнай навуцы. Ён характарызаваўся імкненнем вучоных стварыць аб'ектыўную гісторыю сваёй краіны, якая б не залежыла ад ідэалогіі ўладаў і заснаваную на дакументальных крыніцах з адчыненых для даследаванняў архіваў. Дзякуючы гэтаму многія гістарычныя падзеі і факты атрымалі іншае, часта супрацьлеглае папярэдняму, асвятленне. У той жа час узнікла неабходнасць вывучэння новых, раней ігнараваных, аспектаў гісторыі. Менавіта такой стала для беларускіх гісторыкаў яўрэйская гісторыя. Надзвычайную цікаўнасць яна выклікала як у саміх яўрэйскіх навукоўцаў, так і ў даследчыкаў гісторыі Беларусі ў цэлым [1, с. 11].

Навукоўцы Рэспублікі Беларусь актыўна далучыліся да ўдзелу ў канферэнцыях па гісторыі яўрэйскага этнасу і тым самым падцвердзілі з'яўленне новага накірунку ў гістарыяграфіі – гісторыі беларускіх яўрэяў. Асабліва знакавай была міжнародная навуковая канферэнцыя, арганізаваная нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам ім. Ф. Скарыны ў 1994 г.: "Яўрэйская культура Беларусі і яе

ўзаемадзеянне з беларускімі і іншымі культурамі”. Зборнік матэрыялаў гэтай канферэнцыі “Беларусіка. 4.” [24] адлюстраваў усю сур’ёзнасць адносін навуковай грамадскасці Рэспублікі Беларусь і замежных даследчыкаў да праблемаў вывучэння гісторыі яўрэяў Беларусі. Зборнік змяшчае артыкул “Яўрэі і земляробства ў Беларусі” [25] пад аўтарствам беларускіх гісторыкаў У.А. Сосна і С.М. Ходзіна. Даследчыкі паспрабавалі зрабіць аналіз аграрнага эксперыменту расійскага ўрада над яўрэйскім насельніцтвам мяжы аселасціі і прыйшлі да высноў, што эксперымент не меў поспехаў па прычыне непаслядоўнасці заканадаўчай палітыкі ўрада і адсутнасці неабходных матэрыяльных рэсурсаў для рассялення і грашовай падтрымкі яўрэйскіх земляробаў.

У.А. Сосна працягвае звяртацца да гісторыі яўрэйскіх сялян у сваёй манаграфіі, прысвечанай гісторыі сялянства Беларусі. На думку аўтара, спробы царскага ўрада прымацаваць яўрэяў да зямлі не мелі поспеху не з прычыны няздольнасці яўрэяў да вядзення сельскай гаспадаркі, а ў сувязі з канкрэтнымі гістарычнымі абставінамі, якія не садзейнічалі развіццю такой традыцыі [26, с. 100].

Трэба адзначыць, што ў канцы 90-х гадоў XX стагоддзя ў асноўным адбывалася накапленне гістарычных дакументаў і матэрыялаў, вылучэнне навуковых падыходаў і складванне методыкі вывучэння яўрэйскай гісторыі Беларусі. Гэта падцвярджае з’яўленне першых выданняў, аўтары якіх імкнуліся злучыць папулярнасць падачы матэрыялу з гісторыка-навуковым падыходам. Асаблівую значнасць набылі працы Э.Р. Іофе. Яго кнігі і шматлікая колькасць артыкулаў, напісаныя ў папулярным стылі, знаёмяць чытача з гісторыяй, культурай, традыцыямі яўрэяў Беларусі [27, 28]. Даследаванне асобных аспектаў яўрэйскай аграрнай гісторыі на Беларусі без уліку такога кшталту прац будзе няпоўным. Акрамя таго, кнігі аўтара падаюць шмат факталагічнага матэрыялу, што прадстаўляе інтарэс не толькі для масавага чытача, але і для навукоўцаў.

Актуальнымі пры даследаванні сельскагаспадарчага жыцця яўрэяў Беларусі будуць працы па гісторыі гарадоў і мястэчак Беларусі, дзе на працягу XIX стагоддзя масава пражывала яўрэйскае насельніцтва. Аўтары такіх прац звычайна стараюцца ўсебакова ахарактарызаваць жыццё яўрэяў у тым ці іншым населеным пункце. Таму пры даследаванні спецыфічных рыс аграрнага жыцця яўрэяў абавязковым будзе знаёмства з працамі такіх даследчыкаў яўрэйскай гісторыі, як Л. Смілавіцкі, А. Падліпскі, Л. Шкуцько, А. Шульман, В. Сабалеўская, А. Разенблюм і інш. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на навуковыя працы В.А. Сабалеўскай, у прыватнасці, на яе артыкул “Сельскохозяйственная деятельность евреев Белоруссии в XIX веке” [29], дзе гісторык аналізуе аграрную палітыку Расійскага ўрада па стварэнню яўрэйскіх земляробчых калоній на прыкладзе Гродзенскай губерні. Тэма яўрэйскага земляробства на Беларусі таксама ўзгадваецца ў манаграфіі аўтара “Повседневная жизнь евреев Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX века” [30, с. 134–144, с. 191].

Як ужо адзначалася, аграрная палітыка Расійскай імперыі ў адносінах да яўрэяў уяўляе сабой той бок гістарычнага мінулага, даследаванне якога немагчыма без глыбокага аналізу расійскага заканадаўства. Больш таго, заканадаўчыя акты таго перыяду з’яўляюцца важнай гістарычнай крыніцай па гісторыі сацыяльна-эканамічнага становішча беларускага яўрэйства. У гэтым накірунку праводзіць свае даследаванні Ю.В. Функ. У сваёй працы “Евреи Беларуси в конце XIX – начале XX вв.” даследчыца случна адзначае, што жыццё беларускіх яўрэяў можа быць дастаткова вывучана на падставе заканадаўчых актаў таго часу, так як менавіта заканадаўства з’яўлялася галоўным рэгулятарам усіх бакоў грамадскага жыцця [31, с.14].

Асобна хацелася б звярнуць увагу на выданні навуковага штогодніка “Цайтшрифт”, («Tsaytshrift»,«צײַטשריפֿט»), які цалкам прысвечаны яўрэйскім даследаванням. Прэзентацыя першага нумара адбылася ў 2011 годзе. Штогоднік ставіць сваёй мэтай асвятляць навуковыя пытанні беларускай і ўсходнееўрапейскай юдаікі і пазіцыянуецца як выданне, якое працягвае традыцыі беларускай юдаікі, закладзеныя часопісам «Цайтшрыфт» у 1926–1931 гадах. У першым нумары штогодніка яўрэйскай сельскагаспадарчай каланізацыі на Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя прысвечаны асобны раздзел, дзе прадстаўлены адпаведныя тэматычныя артыкулы такіх навукоўцаў, як І. Сосіс, Ш. Баравы, А. Бужэвіч [32–34]. Абагульняючай рысай іх прац з’яўляецца акцэнтаванне ўвагі на той катэгорыі яўрэйскага насельніцтва, якое пакідала беларускія тэрыторыі для ўдзелу ў стварэнні земляробчых калоній на тэрыторыі ўкраінскіх губерняў.

Сучасная рассійская гістарыяграфія даволі багатая на даследаванні па яўрэйскай гісторыі. Разглядаючы пытанне аграрнай палітыкі царскага ўрада ў адносінах да яўрэяў мяжы аселасці, неабходна звярнуць увагу на працы А.Б. Міндліна. Значнае кола яго артыкулаў прысвечана прававому становічшу яўрэйскага насельніцтва Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XX стагоддзя, гісторыі дзейнасці Камітэтаў па яўрэйскаму пытанню [35–37]. Асаблівасцю навуковых прац А. Міндліна з’яўляецца тое, што розныя бакі яўрэйскай гісторыі падаюцца ў адпаведнасці з храналогіяй праўлення расійскіх імператараў. Аўтар акцэнтуе ўвагу на залежнасці палітыкі па яўрэйскаму пытанню ад асабістага стаўлення імператараў да яўрэйскага этнасу.

Адным з апошніх расійскіх даследаванняў, у якім закранаецца пытанне прававога рэгулявання яўрэйскай земляробчай каланізацыі ў Расійскай імперый, з'яўляюцца артыкулы і дысертацыя [38, 39] расійскага гісторыка права Я.У. Абакумавай. Аўтар разглядае прававы статус яўрэяў у Расійскай імперыі ў сферы арганізацыі імі земляробчых калоній, аналізуюцца прычыны, з якіх дзяржава імкнулася прымусіць яўрэяў займацца сельскай гаспадаркай, заканадаўства, якое рэгулявала адпаведныя праваадносіны і паследствы такой палітыкі.

Гісторыя стварэння яўрэйскіх земляробчых калоній набыла папулярнасць сярод украінскіх гісторыкаў. Даследаванні В. Нахмановіча, Р. Бесіцкага, У. Шчукіна [40–43] раскрываюць гісторыю стварэння яўрэйскіх калоній, арганізацыю школьнай адукацыі, духоўна-культурнае жыццё яўрэйскіх земляробаў. Знаёмства з гэтымі даследаваннямі дазваляе правеці параўнальную характарыстыку паміж яўрэйскімі земляробчымі пасяленнямі на тэрыторыі беларускіх і ўкраінскіх губерній, зрабіць высновы аб агульных і адрозных рысах заканадаўчай палітыкі адносна яўрэйскіх земляробчых калоній Паўночнага і Паўднёва-Заходняга краю.

Што датычыцца вывучэння гісторыі беларускіх яўрэяў замежнымі даследчыкамі, то тут доўгі час існавалі два асноўныя накірункі. Да першага накірунку адносяцца навукоўцы, якія не дзялілі гісторыю рускіх яўрэяў на гісторыю беларускіх, польскіх, украінскіх, літоўскіх яўрэяў. Іх працы насілі агульнанавуковы характар. Другая плынь навукоўцаў займалася вывучэннем выключна палітычнага жыцця яўрэяў [2, с. 13].

Першым заходнім гісторыкам, які ў сваіх працах вылучыў тэрыторыю Беларусі ў асобны рэгіён Расійскай імперыі, стаў С.В. Бэйран. У сваёй працы "The Russian Jew under Tsars and Soviets" [44] ён закрануў такія пытанні яўрэйскай гісторыі, як заканадаўства, антысемізм, адукацыя, дэмаграфічныя змены яўрэйскага насельніцтва, урбанізацыя, міграцыя, рэлігія, культура і інш. Бэйран стараўся ахапіць усю тэрыторыю Расійскай імперыі, пры гэтым у сваёй кнізе ён звяртаецца да тэрыторыі так званай White Russia (Белая Расія), пад якой маюцца на ўвазе беларускія землі .

Значную ўвагу гісторыі стварэння класу яўрэйскіх земляробаў на тэрыторыі Расійскай імперыі і СССР надаваў вядомы гісторык, публіцыст, грамадскі і палітычны дзеяч А.І. Салжаніцын. Нягледзячы на навукова-папулярны характар яго кніг [45, 46], фактычны матэрыял па вызначанай тэме падаецца з захаваннем прынцыпу навуковасці. Каштоўнасць працы ў тым, што аўтар узгадвае гісторыю яўрэйскага аграрнага эксперыменту за перыяд існавання Расійскай імперыі і савецкай дзяржавы.

Апошнія працы ізраільскіх і амерыканскіх даследчыкаў факусіруюць сваю ўвагу на даследаванні культурнай гісторыі яўрэяў Расійскай імперыі і праблем узаемадзеяння яўрэйскіх абшчын з неяўрэйскім асяроддзем. Пытанні аграрнай палітыкі разглядаюцца ў агульным кантэксце заканадаўчай творчасці Расійскай імперыі ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва.

**Заключэнне**. Гісторыя вывучэння яўрэйскай сельскагаспадарчай дзейнасці на Беларусі мае даўнюю традыцыю. Імкненне расійскага ўрада далучыць яўрэяў да земляробчай працы праз актыўную законатворчасць адлюстроўвалася ў тагачаснай навуковай і публіцыстычнай літаратуры. Тым не менш, нягледзячы на папулярнасць праблемы яўрэйскага аграрнага вопыту сярод гісторыкаў, публіцыстаў, грамадска-палітычных дзеячоў, дарэвалюцыйная гістарыяграфія большую ўвагу звяртала на становішча яўрэйскіх калоній на тэрыторыі ўкраіснкіх губерній, і яўрэйскае земляробства на Беларусі ўзгадвалася ў кантэксце іх развіцця. Савецкая гістарыяграфія характарызавался распаўсюджаннем у навуковых працах думкі аб забароненым статусе сельскагаспадарчай дзейнасці для яўрэйскага насельніцтва. Пытанне гісторыі яўрэйскіх земляробчых калоній і пасяленняў на Беларусі стала падымацца ў сучаснай беларускай, украінскай і расійскай гістарычнай навуцы. Аўтары мэтанакіравана звяртаюцца да вывучэння асаблівасцяў заканадаўчай палітыкі царскага ўрада адносна беларускіх яўрэяў-земляробаў, імкнуцца выявіць асаблівасці і падабенствы паміж яўрэйскімі земляробчымі калоніямі Беларусі і Украіны. Аднак агляд навуковых прац на вызначаную тэму паказаў адсутнасць буйных комплексных даследаванняў у сучаснай гістарычнай навуцы. Прыведзеная вышэй навуковая літаратура па праблеме прадстаўлена невялікай колькасцю артыкулаў. Такі стан гістарычных даследаванняў абумовіў больш дэталёвае вывучэнне яўрэйскай аграрнай гісторыі ў кантэксце сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. Герасимова, И.П. Проблемы изучения истории евреев Беларуси в отечественной историографии / И.П. Герасимова // Евреи Беларуси. История и культура: Сборник научных трудов. – Минск :Бестпринт, 1997. – С. 7–18.
2. Киммель, Е. Становление источниковедения истории евреев Беларуси / Е. Киммель // Материалы Шестой Ежегодной междунар. междисциплинарной конф. по иудаике, Москва, 1–3 февр. 1999 г., / редкол.: Р.М. Капланов [и др.]. – Ч. 3 : Еврейская культура и культурные контакты. – С. 26–32.
3. Леванда, В.О. Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев, от Уложения царя Алексея Михайловича до настоящего времени, от 1649–1873 г / В.О. Леванда. – СПб., 1874. – 1158 с.

4. Леванда, В.О. К вопросу о земледелии у евреев в России / В.О. Леванда // Еврейская библиотека : историко-литературный сборник. – 1872. – Т. 2. – С. 347–382.
5. Леванда, В.О. К вопросу о земледелии у евреев в России / В.О. Леванда // Русский еврей. – 1879. – 24 сент. – № 4. – С. 103–107.
6. Леванда, В.О. К вопросу о земледелии у евреев в России / В.О. Леванда // Русский еврей. – 1879. – 31окт. – № 9. – С. 300–303.
7. Оршанский, И.Г. Русское законодательство о евреях: очерки и исследования / И.Г. Оршанский. – СПб. : Типография и литография А.Е. Ландау, 1877. – 456 с.
8. Оршанский, И.Г. Земледельческий труд у евреев / И.Г. Оршанский // Русское законодательство о евреях : очерки и исследования. – СПб. : Типография и литография А.Е. Ландау, 1877. – С. 110–133.
9. Никтин, В.Н. Евреи земледельцы: историческое, законодательное, административное и бытовое положение колоний со времени их возникновения до наших дней. 1807–1887 / В.Н. Никитин. – СПб., 1887. – 276 с.
10. Никитин, В.Н. Еврейские поселения северо и юго-западных губерний (1835 – 1890 гг.) / В.Н. Никитин. – СПб. : Типолитогр. А.Е. Ландау, 1895. – 204 с.
11. Дубнов, С.М. Новейшая история еврейского народа (1789–1881) / С.М. Дубнов – СПб. : Север, 1914. – 631 с.
12. Дубнов, С.М. Евреи в России и Западной Европе в эпоху антисемитской реакции / С.М. Дубнов – М. : изд-во Л.Д. Френкель, 1923. – 148 с.
13. Дубнов, С.М. Евреи в царствование Николая II (1894–1914) / С.М. Дубнов. – СПб. : Кадима, 1922. – 85 с.
14. Дубнов, С.М. Краткая история евреев / С. М. Дубнов. – Ростов н/Д : Феникс, 1997. – 576 с.
15. Гессен, Ю.И. История еврейского народа в России / с предисл. и библиогр., сост. В.Ю. Гессеном при участии В.Е. Кельнера. – М. : Евр. ун-т Иерусалим: Gesharim, 1993. – 241 с.
16. Гессен, Ю.И. О жизни евреев в России. Записка в Государственную Думу / Ю.И. Гессен – СПб. : Общественная польза, 1906. – 135 с.
17. Евреи в Российской Империи XVIII–XIX веков / сост., авт. вступ. ст. и аннот. А. Локшин. – М. : Евр. ун-т Иерусалим: Гешарим, 1995. – 687 с.
18. Ольшамовский, Б.Г. Права по землевладению в Западном крае / Б.Г. Ольшамовский. – СПб. : Типолитография Ю.А. Мансфельдт, 1899 – 139 с.
19. Чериковер, И. Земледелие среди евреев в России [Электронный ресурс] / И. Чериковер // Еврейская энциклопедия Брокгауза-Эфрона. – Режим доступа: http://brockhaus-efron-jewish-encyclopedia.ru/beje/08-2/038.htm. – Дата доступа: 11.12.2012.
20. Землевладение по русскому законодательству [Электронный ресурс] // Еврейская энциклопедия Брокгауза-Эфрона. – Режим доступа: http://brockhaus-efron-jewish-encyclopedia.ru/beje/08-2/035.htm. – Дата доступа: 11.12.2012.
21. Бруцкус, Б.Б. Еврейские земледельческие поселения Екатеринославской губернии (статистико-экономические очерки и исследования) / Б.Б. Бруцкус. – СПб. : Тип. «Экономия», 1913 – 96 с.
22. Рутберг, Н.И. Евреи и еврейский вопрос в литературе советского периода : хронол.-темат. указ. лит., изд. за 1917–1991 гг. на рус. яз. / Н.И. Рутберг, И.Н. Пидевич ; отв. ред. И.А. Беседин ; Центр науч. работников и преподавателей иудаики в вузах "Сэфер". – М. : Грантъ, 2000. – 596 с.
23. Ларин, Ю. Евреи и антисемитизм в СССР / Ю. Ларин. – М. ; Л. : Гос. изд-во, 1929 – 311 с.
24. Беларусіка = Albaruthenika / Міжнар. асац. беларусістаў, Нац. навук.-асвет. цэнтр. ім. Ф. Скарыны // Яўрэйска культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння / рэд.: В. Рагойша, Г. Цыхун, З. Шыбека. – Мінск : Навука і Тэхніка, 1995. – Кн. 4. – 382 с.
25. Сосна, У. Яўрэі і землятробства ў Беларусі / У. Сосна, С. Ходзін // Беларусіка = Albaruthenika / Міжнар. асац. беларусістаў, Нац. навук.-асвет. цэнтр. ім. Ф. Скарыны // Яўрэйска культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння / рэд.: В. Рагойша, Г. Цыхун, З. Шыбека. – Мінск : Навука і Тэхніка, 1995. – Кн. 4. – С. 60–65.
26. Сосна, У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / У.А. Сосна. – Мінск : БДУ, 2000. – 115 с.
27. Иоффе, Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси: Краткий научно-популярный очерк / Э.Г. Иоффе. – Мінск : АРТИ-ФЛЕКС, 1996. – 294 с.
28. Іофе, Э.Р. Яўрэі на Беларусі. / Э.Р. Іофе // Роднае слова – 2005. – С. 97–100.
29. Соболевская, О.А. Сельскохозяйственная деятельность евреев Белоруссии в XIX веке. / О.А. Соболевская // Евреи Беларуси / Израил. культур.-информ. центр, Открытый ун-т Израиля в Беларуси. – Вып. 3–4. – С. 26–34.
30. Соболевская, О.А. Повседневная жизнь евреев Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX века / О.А. Соболевская. – Гродно : ГрГУ, 2012. – 443 с.
31. Функ, Ю.В. Евреи Беларуси в к. 19 – начале 20 в. / Ю.В. Функ // Беларуский научн.–исслед. ин-т документоведенья и арх. дела. – Минск : Бел. НИИДАД, 1998. – 105 с.
32. Сосис, И. Первая попытка привлечь белорусских евреев к сельскому хозяйству / И. Сосис // Цайтшрыфт. – 2011. – Т. 2–3. – С. 109–112.
33. Боровой, Ш. Еврейские колонии после второй волны переселения из Белоруссии / Ш. Боровой // Цайтшрыфт. – 2011. – Т. 2–3. – С. 111–138.
34. Бужевич, А. Положение еврейских колонистов после третьей волны переселения из Белоруссии / А. Бужевич // Цайтшрыфт. – 2011. – Т. 2–3. – С. 137–156.
35. Миндлин, А. «Еврейская политика» Столыпина [Электронный ресурс] / А. Миндлин // Общество «Еврейское наследие». – Режим доступа: http://amindlin.narod.ru/stolypin.htm. – Дата доступа: 21.10.2012.

36. Миндлин, А. Деятельность комитетов, комиссий и совещаний по еврейским реформам в России в XIX – начале XX века [Электронный ресурс] / А. Миндлин // Вопросы истории. – Режим доступа: http://jhist.org/russ/mindlin_01.htm. – Дата доступа: 21.10.2012.
37. Миндлин, А. Евреи при Александре I [Электронный ресурс] / А. Миндлин // Общественно-публицистический и культурно-просветительский журнал еврейских общин России, Украины и других стран СНГ "Корни". – 2004. – Режим доступа: http://amindlin.narod.ru/alex1.htm. – Дата доступа: 21.10.2012.
38. Абакумова, Е.В. Правовое регулирование еврейской земледельческой колонизации в Российской империи в начале XIX века [Электронный ресурс] / Е.В. Абакумова // Государство и право. Юридические науки. – 2004. – Режим доступа: http://naukarus.com/pravovoe-regulirovanie-evreyskoy-zemledelcheskoy-kolonizatsii-v-rossiyskoy-imperii-v-nachale-xix-veka – Дата доступа: 02.07.2013.
39. Абакумова, Е.В. Правовое положение евреев в Российской империи в конце XVIII – начале XIX вв. : автореф. дис. ... канд. юр. наук : 12.00.01 / Е.В. Абакумова ; Московский гос. ун-т им. В.М. Ломоносова. – М., 2014. – 26 с.
40. Нахманович, В. Еврейская политика царского правительства в 1870-х гг. Деятельность Комиссии по устройству быта евреев [Электронный ресурс] / В. Нахманович. – Режим доступа: http://jhistory.nfurman.com/russ/russ004. – Дата доступа: 27.01.2013.
41. Бесицкий, Р. Как это было. К истории организации еврейских земледельческих колоний в Новороссии [Электронный ресурс] / Р. Бесицкий. – Режим доступа: http://www.vseslova.com. – Дата доступа: 27.01.2013.
42. Щукин, В. Школы в еврейских земледельческих колониях Херсонской губернии в XIX – начале XX вв. / В. Щукин // Научные труды по иудаике : материалы XX Междунар. ежегодной конф. по иудаике. – М., 2013. – С. 62–74.
43. Щукин, В. Здравоохранение и медицинское обслуживание в еврейских земледельческих колониях Херсонской губернии в XIX – начале XX вв. / В. Щукин // Научные труды по иудаике : материалы XX Междунар. ежегодной конф. по иудаике. – М., 2014. – С. 127–143.
44. Le Foll, Claire. The Jews of Belorussia in Western and Russian Historiography [Electronic resource] / Claire Le Foll // Bulletin du Centre de recherche français à Jérusalem. – 2002. – Mode of access: http://bcrfj.revues.org/. – Date of access: 04.02.2012.
45. Солженицын, А. И. Двести лет вместе / А.И. Солженицын – М. : Русский путь. 2001. – Т. 1. – 512 с.
46. Солженицын, А. И. Двести лет вместе / А.И. Солженицын – М. : Русский путь. 2002. – Т. 2. – 512 с.

*Пастуліў 30.11.2017*

## THE JEWISH POPULATION OF BELARUS IN THE AGRARIAN POLICY OF THE RUSSIAN EMPIRE AT THE END OF XVIII - EARLY XX CENTURY: HISTORIOGRAPHY AND THE PRESENT STATE OF RESEARCH

***K. TALIARONAK***

*The article analyzes historiography and present researching of the Belarusian Jews' history, who were engaged in agriculture at the end of XVIII – the begging of XX centuries. We conclude that the history of this question begins since the second half of the XIX century. The first works devoted to the imperial Jewish agricultural policy had journalistic features with the author's subjective attitude. But since the last third of the XIX century a scientific researching tradition of Jewish history has been developed. Some factual data has been collected for the period of XIX – beginning of XXI century. A range of works concerning the history of the Jewish agriculture on the territory of Belarusian and Ukrainian lands in the context of general history of Russian Jewry has appeared. But today there is no one integrated and systematic researching devoted to the history of Jewish farmers in Belarus in the context of Belarusian history, which leads to its thorough analysis and extensive lighting.*

***Keywords:*** *historiography, the Jewish population, Jewish agriculture.*